ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 10(984) | АЎТОРАК, 6 чэрвеня 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР АДОБРАНЫ І ЗАЦВЕРДЖАНЫ

Адбылася канферэнцыя працоўнага калетыву ГДУ. Яе дэлегаты, а таксама запрошаныя дэканы факультэтаў, кіраўнікі структурных падраздзяленняў абмеркавалі праект Калектыўнага дагавора Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны на 2000-2001 г.г., які папярэдне быў апублікаваны ва універсітэцкай шматтыражнай газеце.

Старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі азнаёміў удзельнікаў канферэнцыі з дадаткамі да Калектыўнага дагавора: "Палажэннем аб матэрыяльным стымуляванні работнікаў Гомельскага дзяржуніверсітэта" і "Палажэннем аб аказанні матэрыяльнай дапамогі супрацоўнікам ГДУ", а старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава — з асноўнымі палажэннямі Пагаднення паміж рэктаратам і прафкомам студэнтаў па сацыяльна-эканамічных пытаннях. Гэта пагадненне таксама з'яўляецца дадаткам № 1 да дагавора.

Галоўны нарматыўны дакумент, які рэгулюе працоўныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны паміж адміністрацыяй ГДУ і працоўным калектывам, з улікам некаторых паправак і дапаўненняў, унесеных у яго выступіўшымі на канферэнцыі прарэктарам па вучэбнай рабоце прафесарам С.Ф.Каморнікавым, старшынёй спартклуба Б.М.Гілем, трэнерам жаночай гандбольнай каманды універсітэта В.П.Крукоўскім, загадчыцай планава-фінансавага аддзела С.Я.Пашук, быў аднагалосна адобраны і зацверджаны.

На канферэнцыі выступілі рэктар ГДУ прафесар М.В.Селькін, загадчыца аддзела па прававой і сацыяльнай абароне галіновага прафсаюза В.В.Грэмяшкевіч.

## ЗА ЗДОЛЬНАСЦІ І ТАЛЕНТ

Як вядома, з мэтай фінансавання мерапрыемстваў, накіраваных на стымуляванне інтэлектуальна-творчай дзейнасці моладзі ў галіне адукацыі і навукі, у нашай краіне нядаўна быў створаны спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў.

Пасведчанне аб прысуджэнні заахвочвальнай прэміі названага фонда ўручана к.т.н., дацэнту кафедры МПК М.С.Далінскаму за асабісты ўклад у развіццё здольнасцей таленавітай моладзі па выніках работы за 1999 год.

Пасведчанні стыпендыята фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь атрымалі таксама пяцікурснікі біялагічнага і эканамічнага факультэтаў Ганна Верамейчык і Генадзь Ленінец за асаблівыя поспехі ў вучэбна-пазнавальнай і навукова-даследчай дзейнасці.

**(Наш кар.)**

**РАСКАЗВАЕМ ПРА ІМЯННОГА СТЫПЕНДЫЯТА**



## "УСЁ, АБО НІЧОГА"

Кнігу пад такой назвай Валера прачытаў яшчэ ў дзяцінстве. Гэты дэвіз жыцця славутага палкаводца Аляксандра Македонскага, якому прысвячалася кніга, стаў для хлапчука ўзорам. Яму хацелася, што называецца, "ахапіць неахопнае", усяму самому навучыцца, самому ўсё зрабіць...

Спроба яшчэ ва ўзросце сямі гадоў (праўда, пад пільным наглядам бацькі) правесці чыста біялагічны эксперымент — прышчапіць маленькай яблыньцы шэсць розных гатункаў, завяршылася ўдала. Дрэўца давала плады, і хлапчук адчуваў сябе па-сапраўднаму шчаслівым. Вельмі падабаліся яму і іншыя даследаванні, звязаныя з жывой прыродай. Гэта ў далейшым вызначыла выбар ім сваёй будучай прафесіі.

Прага да дзеяння была закладзена ў яго характары з маленства, і яна карэкціравалася пад мудрым выхаваннем бацькі Валерыя, былога падводніка, які яшчэ з вайсковай службы вельмі паважаў парадак, абавязковасць, дысцыпліну не толькі на караблі, але і ў сям'і. Гэта дапамагала выкрышталізоўваць у характары Валерыя пасля яго самастойных спроб і памылак усё лепшае.

Надзвычайнай актыўнасцю вызначаўся хлапчук і ў школьныя гады. Ён вучыўся ў адной са школ сельмашаўскага мікрараёна, якая лічылася эксперыментальнай, бо давала дзецям не толькі агульнаадукацыйныя веды, але і пасля яе заканчэння спецыяльныя пасведчанні аб атрыманай тут па выбары школьніка той ці іншай спецыяльнасці. Валера Быкоўскі змог адолець іх аж ... 4 — медбрата, цырульніка, па рамонту гадзіннікаў, па пашыву адзення. Цяпер яму ўсе гэтыя навыкі, як ён прызнаецца, вельмі ў жыцці дапамагаюць.

Зараз В.Быкоўскі — студэнт 3-га курса біялагічнага факультэта, выдатнік вучобы, стыпендыят абкома прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Дакладна і старанна выконвае ўсе абавязкі прафорга свайго факультэта. Яго па праву прызнаюць лідэрам і ў групе, дзе ён вучыцца, і на факультэце. Яго актыўнасць асабліва праяўляецца ў час падрыхтоўкі традыцыйных Дзён біёлага, конкурсаў "Ану, першакурснік!". Ён і сам, як кажуць, прайшоў гэтую "школу": калі быў студэнтам першага курса, яго роля ў праграме біяфака на агульнауніверсітэцкім конкурсе "Ану, першакурснік!" была выканана настолькі ярка і запамінальна, што юнака адразу заўважылі, яго здольнасці ацанілі спецыяльным прызам. У тым выпадку праявіўся яго талент, які пачаў развівацца з часу яго заняткаў у школьныя гады ў дзіцячым танцавальным ансамблі "Палеткі".

Цяпер таго дзіцячага максімалізму, аб якім гаварылася вышэй, у Валерыя Быкоўскага паменшала, многае ў сваіх поглядах на жыццё ён пераасэнсаваў і кажа, што "Лепш быць першым тут, чым другім у Рыме". Але засталося галоўнае — разуменне таго, што працаваць над сваім самаўдасканаленнем трэба пастаянна.

**Т.ДУБЯК.**

**На здымку: В.Быкоўскі.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

**УНІВЕРСІТЭТ І РЭФОРМА ШКОЛЫ**

**Вядома, што універсітэты заўсёды былі і застаюцца не толькі цэнтрамі развіцця навукі і культуры, але і аказвалі вялікі ўплыў на арганізацыю і ўдасканаленне адукацыі, у тым ліку на работу агульнаадукацыйнай школы. Зараз у рэспубліцы праводзіцца рэформа школы, і, зразумела, наш універсітэт не можа стаяць у баку ад рашэння звязаных з ёй праблем. Нам трэба ведаць, як праходзіць рэформа, якія плюсы і мінусы ў ёй выяўляюцца, і вызначыць сваю пазіцыю па гэтых пытаннях з тым, каб рабіць уплыў на іх вырашэнне.**

## КАБ ЗНОЎ НЕ НАРАБІЦЬ ПАМЫЛАК

Нядаўна мне давялося быць у навуковай камандзіроўцы ў Маскве. Працаваў у Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы, або ў былой, як яе называлі раней, "Ленінцы". Сустракаўся з вядомымі спецыялістамі ў галіне педагогікі і кіраўнікамі адукацыі. Прымаў удзел у гадавым сходзе Расійскай акадэміі адукацыі (РАА), замежным членам якой з'яўляюся, і маё выступленне на гэтым сходзе было, на мой погляд, успрынята з цікавасцю. Галоўнай тэмай гэтых сустрэч і выступленняў членаў акадэміі на сходзе, натуральна, былі пытанні, якія звязаны з рэформай школы ў Расійскай Федэрацыі. Давялося пачуць самыя супярэчлівыя меркаванні аб сэнсе і змесце будучай рэформы. Але амаль што не рэфрэнам гучала ідэя аб тым, каб будучае рэфарміраванне школы сапраўды садзейнічала рэальнаму паляпшэнню навучання і выхавання вучняў, а не нараджала новыя праблемы і цяжкасці, як гэта адбылося ў 60-70-я гады, калі без належнай апрабацыі быў празмерна ўскладнены змест школьнай адукацыі, паспешліва ствараліся новыя і далёка не якасныя падручнікі, што зрабіла навучанне для большасці вучняў непасільным і рэзка знізіла іх паспяховасць. Думаю, што назапашаны мною матэрыял уяўляе цікавасць для асэнсавання ў калектыве нашага універсітэта ходу школьнай рэформы ў рэспубліцы і дазваляе зрабіць некаторыя вывады для ўдасканальвання нашай работы.

Якія ж пытанні і праблемы ў гэтых адносінах заслугоўваюць увагі і абмеркавання?

У расійскім педагагічным друку і ў прамовах многіх вучоных, выступаўшых на сходзе РАА, падкрэслівалася, што рэформа школы павінна праводзіцца не рэвалюцыйным шляхам, а -- эвалюцыйным. Гэта значыць, што трэба дакладна вызначыць яе сапраўдную сутнасць і тое, што канкрэтна павінна рэфарміравацца. У той жа час рэформу трэба добра падрыхтаваць: аднавіць змест адукацыі, стварыць новыя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, старанна выкарыстоўваць тое карыснае, што было ў нашай школе, **калі яна лічылася лепшай у свеце**. На жаль, гэта не было ў належнай ступені ўлічана ў нашай рэспубліцы, і рэформа пачалася без неабходнай падрыхтоўчай работы. У выніку непрадумана сталі ўводзіцца новыя вучэбныя прадметы, у спешцы рыхтавацца падручнікі, многія з якіх аказваюцца не лепшымі, а горшымі, чым папярэднія.

Многія дзеячы педагагічнай навукі і школьнай практыкі падкрэслівалі, што рэформа павінна, нарэшце, зняць празмерную перагрузку зместу адукацыі, якая зводзіць на нішто ўсе намаганні настаўнікаў па павышэнні якасці навучання і бярэ свой пачатак з 60-70-х гадоў. Вельмі вялікі аб'ём вывучаемага ў школе матэрыялу, зусім без патрэбы мы яго ўскладняем. Ужо ў пачатковых класах дзяцей вучаць элементам лінгвістыкі (паняцці аб фанемах, моцных і слабых пазіцыях галосных у

**(Заканчэнне на 2-стар.)**

### ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць дацэнта кафедры оптыкі **КУРЫЛКІНУ** Святлану Мікалаеўну з паспяховай абаронай у Інстытуце фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.

***

Калектыў фізічнага факультэта горача віншуе выпускніка аспірантуры кафедры оптыкі **АСТАХАВА** Паўла Уладзіміравіча (навуковы кіраўнік — д.ф.-м.н., прафесар Г.С.Міцюрыч) з паспяховай абаронай на спецыялізаваным Савеце пры ГДУ дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры падрыхтоўкі да паступлення ў вну і прафарыентацыі горача віншуюць асістэнта **САФОНАВУ** Іну Мікалаеўну (навуковы кіраўнік — д.ф.-м.н., прафесар А.М.Скіба) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры АЛФК горача віншуюць ст.выкладчыка **ШАРЭНДУ** Сяргея Уладзіміравіча (навуковы кіраўнік — к.пед.н., дацэнт Г.І.Нарскін) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.

# КАБ ЗНОЎ НЕ НАРАБІЦЬ ПАМЫЛАК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-стар.)

слове і г.д.). У праграмах па матэматыцы ў старэйшых класах "праходзяць" вытворныя і інтэгралы, хаця з іх пачынаецца вывучэнне матэматыкі ва універсітэтах і пядінстытутах, і далёка не ўсе школьнікі іх адольваюць.

Перагрузка вучняў мае і другі педагагічны аспект. Існуючыя вучэбныя планы не ставяць дакладных абмежаванняў у адносінах колькасці ўрокаў у вучняў розных класаў. У выніку ўжо ў пачатковых класах вучні займаюцца па 5-6 урокаў у дзень, а ў сярэдніх і старэйшых — па 7-8, што з'яўляецца недапушчальным, але мае распаўсюджанне.

Неадназначнымі з'яўляюцца адносіны да пераводу школы на 12-гадовае навучанне за кошт пачатку навучання дзяцей з 6-гадовага ўзросту. Гэты перавод звычайна тлумачаць, з аднаго боку, сусветнай практыкай навучання дзяцей з гэтага ўзросту, а з другога тым, што гэта быццам бы дазваляе пазбегнуць вучэбнай перагрузкі дзяцей. Пярэчанні апанентаў зводзяцца да таго, што яшчэ ў савецкі перыяд была спроба пачынаць школьнае навучанне дзяцей з 6-ці гадоў, але хутка яна была спынена, паколькі зноў жа не была належным чынам падрыхтавана педагагічна і магла аказаць адмоўны ўплыў на наступнае навучанне дзяцей. На самой справе, калі з першых крокаў навучання дзіця сутыкаецца з сур'ёзнымі цяжкасцямі, што выклікае пэўнае адставанне (а гэта было менавіта так), то гэта адставанне пазбаўляе яго ўсялякай ахвоты да далейшай вучобы. Нездарма Я.А.Каменскі пісаў, што толькі тады, калі дзеці вучацца лёгка і прыемна, яны паспяхова развіваюцца і авалодваюць ведамі.

Практычна нічога не дае навучанне дзяцей з 6-гадовага ўзросту і для пераадолення вучэбнай нагрузкі ў наступных класах. Таму, як адзначалі некаторыя расійскія вучоныя, тут неабходна многае ўзважыць і правесці старанную падрыхтоўчую метадычную работу. У адной альтэрнатыўнай дактрыне адукацыі ў Расіі прапаноўваецца пачынаць навучанне дзяцей, калі да 1-га верасня ім спаўняецца 6,5 гадоў.

Акадэмік А.Дарынскі з Санкт-Пецярбурга выказаў сумненне ў мэтазгоднасці насаджэння вялікай рознатыповасці адукацыйных устаноў, што вядзе да разрыву школ элітарных і школ звычайных, прычым роля і статус апошніх паніжаюцца. У той жа час у свеце ўзмацняецца тэндэнцыя да пераадолення гэтай элітарнасці і стварэння ўмоў для павышэння якасці адукацыі ўсёй моладзі. Дарэчы, у самой ФРГ, адкуль мы пераймаем структуру сярэдняй школы, яна крытыкуецца з боку сацыял-дэмакратаў менавіта за яе элітарны характар.

Крытыкуецца вельмі спрошчаны падыход да дыферэнцыяцыі навучання, калі пад выглядам уліку здольнасцей у асобныя класы зводзяцца вучні, якія больш паспяхова займаюцца, а іншыя класы камплектуюцца з вучняў з нізкай паспяховасцю, прычым такія вучні і класы складаюць у школах пераважную большасць. Нехта апраўдвае такую "дыферэнцыяцыю" неабходнасцю фарміравання ў краіне будучай інтэлектуальнай эліты. Але ж адоранасць і інтэлектуальныя здольнасці не заўсёды можна вызначыць па дадзеных паспяховасці. Выдатны амерыканскі вынаходнік А.Т.Эдзісон быў выключаны са школы з 2-га класа як няздольны. Не паспяваў у вывучэнні матэматыкі і фізікі ў сярэдняй школе А.Эйнштэйн. Не меншую шкоду наносіць вучням залічэнне іх у класы для "няздольных": Яны перастаюць вучыцца, быццам пратэстуючы супраць дыскрымінацыі, прыніжанасці і парушэння правоў асобы.

Усе недапрацоўкі і недахопы рэформы школы ў канчатковым выніку адмоўна адбіваюцца не толькі на якасці навучання, але і на **эмацыянальна-пачуццёвай сферы навучэнцаў**. Няўдачы ў вучобе, нізкая паспяховасць нараджаюць у многіх з іх прыгнечаны, блізкі да стрэсавага эмацыянальны стан, а таксама празмернае нярвова-псіхічнае напружанне. У гэтым прыгнечаным стане яны ідуць у школу, адседжваюць на ўроках і вяртаюцца дамоў. Няцяжка ўявіць, якія перажыванні нараджае ў іх гэтая напружанасць, як адбіваецца яна на іх адносінах да школы і паводзінах. Рост крымінагеннасці, амаральнасці і распаўсюджанне наркаманіі сярод школьнікаў у многім выступаюць у якасці іх выніку. Не праходзіць гэта бясследна і для іх здароўя. Статыстыка паказвае: толькі 22-24% вучняў у Расіі заканчваюць школу здаровымі.

У гутарках з вучонымі на сходзе акадэміі выказвалася думка, што рэфарміраванне школы неабходна пачынаць з павышэння якасці падрыхтоўкі настаўнікаў, чаго ў нас не было зроблена. Настаўнікі павінны добра асэнсаваць мэты і змест рэфарміравання вучэбна-выхаваўчага працэсу і быць у стане ажыццяўляць яго на новым, больш высокім узроўні. На якасці працы настаўнікаў і іх адказнасці за правядзенне рэформы адмоўна адбіваецца іх нізкі прэстыж і сацыяльны статус. Вельмі нізкая аплата працы настаўнікаў у параўнанні з іншымі работнікамі бюджэтнай сферы вымушае іх браць вельмі вялікую колькасць вучэбнай работы, якая даходзіць да 28-34 урокаў у тыдзень.

Шмат недахопаў ёсць у падрыхтоўцы будучых настаўнікаў. Усім бачна, што калі па раскладу студэнты займаюцца па 8-10 гадзін у дзень, як гэта назіраецца зараз, яны пазбаўлены часу для самастойнай вучэбнай і навуковай работы і авалодваюць ведамі па канспектах. Неабходны больш кампактныя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі.

Нельга дапусціць, каб праводзімая рэформа, як і многія папярэднія, замест паляпшэння навучання і выхавання, нараджала новыя недахопы і цяжкасці. На жаль, такая небяспека ёсць.

**І ХАРЛАМАЎ,**
**заг.кафедры педагогікі, акадэмік НАН Беларусі.**

# ЗНАКОМЬТЕСЬ – ПСИХОЛОГИЧЕСКИЙ ТЕАТР!

Каждый из нас, не раз бывая в театре, наслаждался театральной атмосферой, восхищался изумительной игрой актеров, переживая вместе с персонажами представлений, и уходил из зала переполненный эмоциями и чувствами. Покинув театральную атмосферу, мы вливаемся в обычную реальную жизнь, где очень скоро забываем о тех прекрасных минутах, проведенных в театре, и отмечаем, что жизнь наша продолжается в том же русле, без изменений, с теми же повторяющимися проблемами, которые по-прежнему остаются неразрешенными.

Однако есть другой театр, в который, если посчастливится, вы можете попасть. Его представления влияют на внутренний мир, привнося в него изменения, трансформируя взгляды, представления о самом себе и окружающем мире. Зрители приходят в психологический театр, как и в любой другой, но неосознанно (а иногда сознательно) становятся участниками представления и даже — главными героями происходящего действа.

Такой театр работает в нашем университете на базе лаборатории прикладной психологии, руководителем которого является Людмила Тутынина. Свое появление он уже ознаменовал презентацией, которую участники и зрители "окрестили" фестивалем психологических театров, потому что в презентации участвовали еще два коллектива: психологические театры Гомельского педагогического колледжа им.Л.С.Выготского и средней школы № 56.

Чем отличается психологический театр от обычного? Во-первых, участники такого театра — непрофессиональные актеры, это обычные люди. Они пришли в психологический театр не для того, чтобы показывать что-то для кого-то, а чтобы осуществлять позитивные изменения в себе, приумножать уверенность в своих силах и помогать в этом отношении другим. Во-вторых, для них не играют первостепенную роль актерские специальные умения и навыки, потому что они не играют чужих сценариев и ролей, они прежде всего играют самих себя, какими они являются в реальной жизни, они произносят со сцены *свои слова и свои монологи*, отражающие их взгляды на себя, других людей, на жизнь. В-третьих, проблемы, которые затрагивает психологический театр, являются актуальными для большинства из нас. В-четвертых, нам всем хорошо знакомо чувство, которое возникает после изумительной игры актера, сыгравшего героя, похожего на нас. У нас может возникать желание непосредственно вступить с ним в контакт, пожать ему руку, но герой — не реальный, и это может нас разочаровывать. В психологическом театре нет выдуманных героев, они реальны, с ними можно дискутировать, выражать свое восхищение, или, наоборот — помогать ему в решении какой-либо проблемной ситуации, проясняя ее более глубоко, задавая вопросы, давая обратную связь, вдохновляя своим собственным примером. Это, в свою очередь, не может не влиять на нашу жизнь и жизнь этого человека.

На презентации вниманию зрителей были представлены различные направления работы психологического театра, затрагивающие экзистенциальные проблемы нашей жизни: от драматизации классического характера в ключе Х.Борхеса, до ситуаций из жизни современной студенческой молодежи.

Этот маленький (потому что все проходило в камерной обстановке на сцене выставочного зала главного корпуса университета, который нам любезно предоставил его директор Сергей Коваль), но замечательный фестиваль оставил настроение праздника души, у каждого была возможность не только встретиться с друзьями, но и найти новых единомышленников, а, главное, встретиться с самим собой с тем, чтобы открыть в себе новые возможности, ресурсы для позитивных личностных изменений. Следующий фестиваль решено провести осенью. Приглашаем Вас влиться в лабораторию творческих поисков, именуемую психологическим театром.

**И.КОВЗИК,**
**студент 5-го курса специализации "Практическая психология" факультета физической культуры.**

# СТРАНА, ГДЕ ЕСТЬ ЧЕМУ ПОУЧИТЬСЯ

(Продолжение. Начало в №8)

## ПОДГОТОВКА И ПЕРЕПОДГОТОВКА КАДРОВ

Если биржи труда Дании помогают найти работу, то нужным специальностям обучают центры подготовки кадров (АМУ). Они созданы и эффективно действуют в каждом амте. По Дании их всего 23, относятся они к Министерству труда.

Каждый АМУ является самостоятельной финансовой единицей. Его услугами может воспользоваться любой гражданин. Основные направления деятельности АМУ — повышение квалификации рабочей силы для региона; переподготовка кадров, если квалификация устарела; расширение круга умений и навыков для всех желающих; обучение безработных; курсы общеобразовательного порядка; очень популярны информационные технологии (обучение работы на компьютере).

Центры тесно сотрудничают с коммунами (чтобы быть в курсе проводимой ими политики на рынке труда), с предприятиями и организациями (от их потребностей и заказов нанимателя зависит направление работы АМУ на конкретный промежуток времени), с образовательными учреждениями (профтехучилищами, техникумами), другими АМУ, службами занятости, кассами по безработице.

Обучение бесплатное для обучающихся. Курсы краткосрочные. Минимальные — 1 неделя, максимальные — 4 недели. Через один АМУ в среднем в год проходит около 20 тысяч человек. На время учебы за работником сохраняется заработная плата. Специальности самые разнообразные — от информационных технологий и процессного производства до уборки помещений и обслуживания.

Обучение только практическое (никакой теории). Некоторые виды обучения обязательны. К примеру, чтобы обновить права, водители-дальнобойщики должны прослушать курсы по работе с опасными грузами.

Большую работу центры проводят с эмигрантами и беженцами: практическое обучение языку, культура, обычаи, адаптация.

Главная идея центров — обучение в течение всей жизни — "век живи, век учись".

Наряду с центрами по переподготовке кадров широко функционируют образовательные центры. Главная их цель — народное просвещение, помочь человеку сориентироваться в окружающем мире, разрешить возникшие социальные проблемы. Центры оказывают услуги лицам любого возраста от 18 до 61 года. Большинство составляют женщины 35-50 лет. В день центр посещает до 100 человек.

## СОЦИАЛЬНОЕ ОБСЛУЖИВАНИЕ

В Дании достаточно высок уровень социальной защиты граждан. Любой желающий может получить бесплатное образование, в том числе и высшее. В высшем учебном заведении учиться можно, пока не доучишься. Государство даже будет платить стипендию, правда, только первые шесть лет, остальное время — учеба бесплатная, но стипендии уже не будет.

Размер стипендии зависит от того, живешь дома или вне дома. В вузе стипендия составляет 1900 крон для тех, кто обучается по месту жительства, и около 3500 крон для тех, кто вынужден снимать жилье. Однако с этих сумм взимаются и налоги.

Здравоохранение тоже бесплатное, кроме стоматологии. Однако сами датчане платят за лекарства. Стоят они достаточно дорого.

Поскольку для Дании характерна децентрализация, за работу больниц, семейных врачей, профилактическую работу отвечают амты.

Округ Вайле имеет 6 больниц на 1700 мест, где работает примерно 500 врачей. В год амбулаторное лечение получают около 75 тысяч пациентов.

Финансирование больницы Вайле обходится амту в 2 млрд. крон.

Датчане гордятся низким уровнем наркомании и СПИДа благодаря большой разъяснительной работе.

## ПРОФСОЮЗНОЕ ДВИЖЕНИЕ

Профгруппы создаются на всех предприятиях с численностью более 6 человек. Возглавляет профгруппу доверенное лицо, которое проходит надлежащее обучение (в течение двух лет обучается на специальных курсах по 1-2 недели за раз), во время которого сохраняется заработная плата. Каждая профгруппа имеет своего представителя по охране труда.

Доверенное лицо действует на основании коллективного договора, который заключается в каждой отрасли и содержит все "правила игры" для конкретной отрасли промышленности. Структуру профсоюзного движения можно представить следующим образом: федерация профсоюзов, местное отделение профсоюзов, профгруппа.

Трудовые споры между работниками и нанимателем разрешает суд по разрешению трудовых споров.

Наша группа посетила местное отделение профсоюза SID в Гиве, где его председателем Ханне Иоргенсеном был оказан прием на уровне белорусского гостеприимства. SID — профсоюз неквалифицированных рабочих — объединяет 320 тыс. членов, имеет 275 отделений (в каждой коммуне). Численность отделения может колебаться от 300 до 5 тыс. членов профсоюза.

Профсоюзное отделение в Гиве имеет 5 оплачиваемых работников. Функционирует за счет взносов, которые в данном отделении составляют 1 081 крону. Можно выделить 3 составляющих профсоюзных взносов:

— взнос на досрочную пенсию уплачивается на протяжении 25 лет. В таком случае по достижении 60 лет можно уйти на досрочную пенсию и до достижения пенсионного возраста — 65 лет — получать 130 тысяч крон в год (7 крон примерно 1 доллар);

— "страховка на безработицу", или касса по безработице. Если в год работник проработал 1924 часа, он может получать в течение 1 лет пособие, которое достигает до 90% зарплаты, но не более 2600 крон в неделю;

- взнос собственно на профсоюз — на оплату работы администрации федерации, на местные отделения (каждому работнику платят примерно одинаковую зарплату независимо от поста, около 22 тыс. в месяц).

Кроме этого, профсоюз может получать дотации от государства.

**И.ЭСМАНТОВИЧ,**
**доцент кафедры гражданско-правовых дисциплин юридического факультета.**

(Окончание в следующем номере)

# ГОМЕЛЬСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ им. Ф.СКОРИНЫ ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЁМ СТУДЕНТОВ НА 1 КУРС ЗАОЧНОГО ФАКУЛЬТЕТА на 2000 год

В университет принимаются граждане Республики Беларусь и белорусы, проживающие за её пределами; граждане Российской Федерации, Республики Казахстан, Киргизской Республики; лица, постоянно проживающие на территории республики или имеющие статус беженца.

Указанные категории лиц имеют право получить в университете на базе среднего образования на конкурсной основе бесплатное высшее образование, если образование данного уровня получается впервые.

Граждане других зарубежных стран принимаются в университет на основе договоров с оплатой обучения.

Университет осуществляет приём студентов сверх плана приёма на условиях договоров с оплатой обучения юридическими или физическими лицами. На места сверх плана приёма, количество которых определяется приемной комиссией, на конкурсной основе зачисляются:

— абитуриенты, которые положительно сдали вступительные экзамены, но не прошли по конкурсу в университет;

— абитуриенты, которые имеют направления предприятий (организаций) и положительно прошли собеседование по предметам вступительных экзаменов.

**Собеседование проводится с 7 по 8 сентября. Приём заявлений** от абитуриентов, поступающих в университет на условиях договоров с оплатой обучения, осуществляется **с 2 по 6 сентября.**

**Приём заявлений с 7 августа по 17 августа. Вступительные экзамены с 21 августа. Зачисление** в состав студентов: **по плану — до 2 сентября, на условиях оплаты — до 9 сентября.**

Поступающие в университет подают в приёмную комиссию следующие документы:

— заявление установленного образца на имя ректора;

— документ государственного образца о среднем образовании в оригинале;

— государственный сертификат (для тех, кто прошел централизованное тестирование и поступает на специальность "Автоматизированные системы обработки информации");

— 6 чёрно-белых фотографий размером 3х4;

— медицинскую справку по форме 086У;

— выписку из трудовой книжки (для тех, кто работает);

— справку из службы занятости населения (для тех, кто находится на её учёте);

— документы, которые подтверждают право абитуриентов на льготы, установленные законодательством Республики Беларусь, или свидетельствуют о личных талантах и способностях абитуриентов. Эти документы предоставляются в приёмную комиссию до начала вступительных экзаменов.

Абитуриенты, поступающие не в год получения среднего образования, обязаны представить документы, которые подтверждают их работу или учёбу за годы, предшествующие поступлению (диплом, выписку из трудовой книжки, справку из службы занятости населения и др.).



Паспорт или другое свидетельство личности, выданное органами МВД, предъявляются в приёмную комиссию абитуриентом лично.

Все вступительные экзамены, за исключением экзамена по белорусскому или русскому языку и литературе для поступающих на нефилологические специальности, являются конкурсными. Они (кроме экзамена по спецфизподготовке) проводятся по программам, которые составлены в соответствии с учебными программами общего среднего образования и утверждены Министерством образования Республики Беларусь. Все экзамены проводятся с оценкой знаний по шестибалльной системе (2; 3; 3,5; 4; 4,5; 5).

Абитуриенты, которые не явились на экзамен без уважительных причин или получили неудовлетворительную оценку, к дальнейшим экзаменам не допускаются.

Апелляции по вопросам экзаменационных оценок подаются ответственному секретарю приёмной комиссии на имя ректора в день проведения устного экзамена или в день объявления оценки по письменному экзамену. Повторная сдача экзамена не разрешается.

**Перечень вступительных экзаменов :**

| Специальности | Экзамены |
|---|---|
| Русский язык и литература | 1. Русский язык (диктант)<br>2. Русский язык и литература (устно)<br>3. Белорусский язык и литература (устно) |
| Белорусский язык и литература | 1. Белорусский язык (диктант)<br>2. Белорусский язык и литература (устно)<br>3. Русский язык и литература (устно) |
| Математика<br>Бухгалтерский учет, анализ и аудит<br>Экономика и управление на предприятии | 1. Математика (устно)<br>2. Математика (письменно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| Автоматизированные системы обработки информации | 1. Физика (устно)<br>2. Математика (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| История | 1. История Беларуси (устно)<br>2. Иностранный язык (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (сочинение) |
| Правоведение | 1. История Беларуси (устно)<br>2. Математика (устно)<br>3. Иностранный язык (устно)<br>4. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (сочинение) |
| География | 1. География (устно)<br>2. Математика (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| Биология | 1. Биология (устно)<br>2. Химия (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |
| Физическая культура и спорт | 1. Экзамен по спецфизподготовке<br>2. Биология (устно)<br>3. Белорусский язык и литература или русский язык и литература (изложение) |

При приёме на специальность "Автоматизированные системы обработки информации" засчитываются результаты централизованного тестирования в соответствии с представленным государственным сертификатом.

Зачисление в университет проводится по конкурсу. В первую очередь зачисляются абитуриенты, имеющие среднее специальное или профессионально-техническое образование, или стаж практической работы не менее шести месяцев и поступающие на соответствующие или родственные специальности. Конкурс проводится по специальностям.

Другие лица, имеющие одинаковый или высший балл, зачисляются в пределах 20% от контрольных цифр приёма по данной специальности.

Выпускники подготовительного отделения при университете зачисляются в соответствии с "Положением о подготовительном отделении при Гомельском государственном университете имени Ф.Скорины". Лица, которые прошли обучение через другие формы довузовской подготовки при университете, зачисляются на общих основаниях.

Лица, закончившие среднее общеобразовательное учебное заведение с медалью, среднее специальное или профессионально-техническое учебное заведение (на основе базовой школы с получением среднего образования) с дипломом с отличием, сдают все вступительные экзамены и участвуют в общем конкурсе.

Вне конкурса при получении положительных оценок на вступительных экзаменах зачисляются:

— воины-интернационалисты;

— дети-сироты и дети, оставшиеся без опеки родителей;

— дети из семей военнослужащих или рабочих и служащих, которые занимали штатные должности в воинских частях, погибших (умерших) или ставших инвалидами во время прохождения воинской службы или работы в составе советских войск на территории государств, где велись боевые действия, а также дети из семей военнослужащих, погибших (умерших) в мирное время при прохождении воинской службы;

— дети из семей лиц начальственного и рядового состава органов внутренних дел, погибших (умерших) или ставших инвалидами при исполнении служебных обязанностей на территории государств, где велись боевые действия, а также погибших (умерших) в мирное время при исполнении служебных обязанностей;

— инвалиды I и II групп, а также дети-инвалиды, которым в соответствии с заключением медико-реабилитационных экспертных комиссий не противопоказано обучение в ВУЗе и которые могут посещать занятия;

— лица, которые имеют льготы в соответствии со ст.18 Закона Республики Беларусь "О социальной защите граждан, потерпевших от катастрофы на Чернобыльской АЭС". Абитуриентам этой категории, которые закончили учебные заведения с отличием (с отличными оценками) зачисляются по результатам собеседования по предметам вступительных экзаменов. Собеседование проводится 22 августа;

— белорусы зарубежья по рекомендациям белорусских организаций или учебных заведений зарубежья на специально выделенные органами управления учебными заведениями места.

При равенстве конкурсных баллов преимущество имеют:

— инвалиды III группы при отсутствии медицинских противопоказаний;

— лица, которые имеют льготы в соответствии со ст.19, 20, 23, 24, 25 Закона Республики Беларусь "О социальной защите граждан, потерпевших от катастрофы на Чернобыльской АЭС";

— уволенные в запас военнослужащие, имеющие льготы, установленные законодательством, и рекомендации воинских частей;

— выпускники Национального государственного гуманитарного лицея имени Якуба Коласа при поступлении на соответствующие специальности;

— лица, имеющие стаж работы не менее двух лет;

— медалисты средних общеобразовательных учебных заведений, отличники средних специальных учебных заведений и ПТУ на основе базовой школы, а также отличники ПТУ на основе средней школы при поступлении на специальности, соответствующие полученным профессиям;

— профессионально ориентированные абитуриенты (закончили факультет довузовской подготовки и профориентации, имеют стаж работы по специальности, соответствующей избранной, или другую профессиональную ориентацию).

Для получения второго высшего образования, как правило, принимаются лица на условиях полной оплаты обучения. Порядок зачисления этих лиц определяется соответствующим положением.

Все другие вопросы, связанные с приёмом, окончательно решаются приёмной комиссией университета на основе законодательства Республики Беларусь и "Порядка приёма в государственные высшие учебные заведения Республики Беларусь на 2000 год".

Документы направлять по адресу: 246699, г. Гомель, ул. Советская, 104, Гомельский госуниверситет им. Ф.Скорины, приёмная комиссия. Телефоны: 56-73-38 (приёмная комиссия), 57-69-17 (ответственный секретарь).

**РЕКТОРАТ.**

# "Паэзія мне засціць вочы..."

Дваццацігадовы юнак амаль яшчэ з дзіцячым тварам і задуменным поглядам незвычайна светлых, чыстых вачэй... Паэт-летуценнік, паэт-рамантык... З вуснаў яго абавязкова прагучыць лёгкае, празрыстае, не абцяжаранае складанымі вобразамі і ідэямі мастацкае слова, прагучыць як гімн Жыццю, Маладосці, Каханню...

Менавіта так мы, студэнты 4-га курса філалагічнага факультэта, уяўлялі сабе па фотаздымку Янку Лайкова, пачынаючага творцу, які павінен быў прыехаць да нас з толькі што выдадзенай у серыі "Бібліятэка часопіса "Маладосць" першай кнігай паэзіі "Логіка пасткі". Але тыя з нас, хто ўжо раней пазнаёміўся з вершамі маладога паэта, разумелі ўсю павярхоўнасць, недакладнасць і зманлівасць першага ўспрымання.

І таму сустрэча з самім аўтарам, арганізаваная кафедрай беларускай літаратуры, стала для нас нечаканасцю, своеасаблівым адкрыццём. Бо сапраўды, здавалася дзіўным і амаль недарэчным чуць з вуснаў гэтага сарамлівага, сціплага хлопца, нашага равесніка, вельмі інтэлектуальную, глыбокую, філасофскую паэзію, якая ўдала спалучае ў сабе традыцыі і наватарства, прадстаўляючы тым самым свой, індывідуальны падыход да жыцця і яго адлюстравання. Такія творы, як кажуць філолагі, могуць належаць мудраму сталаму паэту ці надзвычай таленавітай асобе, якая дзякуючы адоранасці і інтуіцыі, здольна прадчуваць у сваім утрапенні тое, што многія пачынаюць разумець занадта позна.

Значыць, Муза калісьці пацалавала Янку. Можа тады, калі ў пасёлку Метча Барысаўскага раёна ў сям'і настаўнікаў, прафесійных філолагаў, толькі нарадзіўся гэты белагаловы хлапчук. А магчыма ў той час, калі маці прачытала будучаму паэту першую казку. Ці калі Янку гушкалі на руках многія вядомыя беларускія пісьменнікі, сябры бацькі — дырэктара школы, які часта запрашаў іх у госці.

На гэтае пытанне так ніхто і не адказаў: ні сам аўтар, ні ягоныя бацькі, што прыехалі разам з сынам.

Знаёмства з бацькамі паэта ўсіх вельмі ўзрадавала, бо часам, усхваляючы таго ці іншага творцу, яго дасягненні і перамогі, мы зусім забываем пра ўдзячнасць тым людзям, якія не толькі падаравалі жыццё адоранаму дзіцяці, але і стварылі ўсе ўмовы для развіцця таленту, рэалізацыі задачы Мастака на гэтай зямлі.

І таму вельмі цікава было чуць не толькі вершы Янкі, выступленні выкладчыкаў і студэнтаў, што спрабавалі выказаць свае меркаванні пра паэзію Лайкова, але і ўспаміны маці аб дзяцінстве хлопца, яго інтарэсах і захапленнях.

Шмат было зададзена пытанняў аб планах паэта на будучыню, творчых задумах, разуменні свайго прызначэння. Зразумела, што кароткай сустрэчы не хапіла, каб пачуць адказы на ўсе пытанні, што цікавілі студэнтаў.

Але застаецца спадзявацца, што яшчэ неаднойчы мы пачуем імя і ўбачым у нашым універсітэце гэтага таленавітага юнака са светлымі вачыма...

А сёння хочацца пажадаць маладому паэту творчага росту, натхнення і плёну ў перадоленні цяжкасцей на гэтым вельмі няпростым, але надзвычайна высакародным шляху.

**С.КАГАН,**
**Г.ГАРАДЗЕЦКАЯ,**
**студэнткі 4-га курса філалагічнага факультэта.**

## НЕ ТОЛЬКІ ВУЧОБАЙ ЖЫВЕ СТУДЭНТ

Заканчваецца чарговы навучальны год. Многім сёлетнім выпускнікам ГДУ, якія хутка атрымаюць дыпломы аб вышэйшай адукацыі, студэнцкія гады будуць памятнымі не толькі вучобай, але і творчымі здабыткамі, бо яны з'яўляліся актыўнымі ўдзельнікамі разнастайных мастацкіх калектываў ГДУ. Па традыцыі работнікі культурнага цэнтра, прафком студэнтаў ушаноўваюць такіх актывістаў мастацкай самадзейнасці, уручаюць ім падарункі.

Не стаў выключэннем і сёлетні год. У актавай зале адбыўся гала-канцэрт, у якім прынялі ўдзел усе мастацкія калектывы студэнцкага клуба універсітэта. Былі "перагорнуты" творчыя старонкі адыходзячага навучальнага года, а гледачы ўбачылі ўсё тое лепшае, што было ў бягучым канцэртным сезоне універсітэта.

Рэктар прафесар М.В.Селькін, які выступіў пасля канцэрта, выказаў словы шчырай падзякі самадзейным артыстам, якія заканчваюць сёлета універсітэт, за іх талент, творчасць і разам са старшынёй прафкома Н.І.Колтышавай уручыў ім памятныя падарункі і кветкі.

## ГОСЦЕМ БЫЎ ПІСЬМЕННІК-ЮБІЛЯР

На зыходзе майскіх дзён жаданым госцем студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў філалагічнага факультэта быў шырока вядомы ў нашай краіне і за яе межамі дзіцячы пісьменнік, прэзідэнт Беларускага дзіцячага фонду Уладзімір Ліпскі, які ў мінулым месяцы адзначыў сваё 60-годдзе.

Сустрэча з земляком (нарадзіўся ў Рэчыцкім раёне) стала запамінальнай падзеяй у культурным жыцці філфакаўцаў. Больш падрабязна аб ёй чытачы нашай газеты даведаюцца з публікацыі наступнага нумара.

## СТАЛІ ЛАЎРЭАТАМІ

У Міжнародным экалагічным універсітэце імя А.Д.Сахарава (г.Мінск) адбылася рэспубліканская канферэнцыя маладых вучоных і студэнтаў "Сахараўскія чытанні". У яе рабоце прымалі ўдзел прадстаўнікі БДУ, шэрагу іншых сталічных вну, ГДУ імя Ф.Скарыны, Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, Мазырскага дзяржаўнага педінстытута імя Н.К.Крупскай.

Наш універсітэт на канферэнцыі прадстаўлялі і выступілі з дакладамі асістэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін А.А.Гарнасталёў і студэнт 3-га курса біяфака В.Быкоўскі. Яны ўдастоены звання лаўрэатаў канферэнцыі.

*Несколько советов по поводу*

## КАК ПРАВИЛЬНО УЧИТЬСЯ



**Идет сессия... Весьма кстати окажутся ниже публикуемые советы, которые помогут студентам продуктивнее подготовиться к экзаменам.**

Есть две разновидности студентов: один "усерден", как пчела, другой "авантюрист".

"Усердный" выучил наизусть почти все, но, несмотря на это, на экзаменах он беспомощен, все "вылетает" из головы. Он не может воспользоваться даже самыми прозрачными подсказками экзаменатора, его "заклинило". Страх перед предполагаемыми опасностями вытесняет способность ясно мыслить. Что же в таких случаях делать? Надо исходить из того, что боязливый человек может ждать помощи только от себя самого. Он должен научиться преодолевать страх и больше доверять себе. Надо всегда помнить, что мужество воспитывается только тогда, когда ты сознательно идешь навстречу опасности.

Другой тип студентов, который также плохо сдает экзамены, имеет совершенно противоположные свойства. Он почти ничего не знает о предмете, но умеет замаскироваться уверенным поведением. Подобная тактика годится всего на несколько минут и действует только на неопытных экзаменаторов. Представители этого типа пользуются общими словами, высказывают много расхожих истин. При этом надо помнить, что, как правило, много говорит тот, кто мало знает. Недостаток знаний он компенсирует избытком напускной самоуверенности.

А как же должен выглядеть "идеальный" студент? Он хорошо знает материал, он может волноваться, но не боится экзаменов и чувствует себя уверенно. Он конкретно отвечает на поставленные вопросы, не "растекается мыслью по дереву".

Оптимизм "идеального" студента базируется на фундаменте его систематических занятий, которые дают прочные знания. Поэтому он умеет правильно готовиться к экзаменам. А что это значит?

Прежде всего в период сессии особенно необходимо вести здоровый образ жизни: правильно питаться, соблюдать режим и нормы гигиены, хорошенько высыпаться. Зубрить всю ночь — толку мало. Напротив! Человек начинает нервничать, когда "ничего не лезет в голову". Он прибегает к кофе, чтобы подхлестнуть себя, и этот порочный круг трудно разомкнуть. Если вы уж вбили себе в голову, что без "допинга" вам не обойтись, выпейте чашку крепкого чая. Чай "пробуждает", а кофе "возбуждает"!

И не забудьте устраивать перерывы! Можно порекомендовать четыре вида интервалов.

**Очень короткая пауза.** Положите карандаш (ручку) на стол, выгляните в окно. Такие паузы человек часто делает неосознанно. Они должны длиться не дольше минуты, при этом нельзя покидать свое рабочее место.

**Мини-пауза.** Человек встает из-за стола, может походить, открыть окно, перекинуться с кем-нибудь несколькими словами. Такая пауза длится минут 5. Подобный интервал следует устраивать каждые полчаса.

Примерно через каждые два часа интенсивного "штудирования" следует устраивать перерыв другого рода, назовем его "**перерывом для кофе**". Для этого лучше всего перейти в другую комнату, чтобы на время сменить обстановку. Можно посмотреть газету, полить цветы на подоконнике или, если есть возможность, понаблюдать за рыбами в аквариуме. Кстати, последнее занятие является прекрасным отдыхом.

Если подготовка к экзамену продолжается дольше 3 часов, то после 180 минут интенсивных занятий следует делать длительный перерыв, который можно назвать "**паузой отдыха**". Он должен длиться не менее одного часа, но не более двух, иначе придется снова настраиваться на тему. Наиболее рационально заниматься два раза в день по три часа.

## СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ




**На спартыўных спаборніцтвах рознага рангу паспяхова выступае зборная каманда універсітэта па плаванні.**

**На здымку (злева направа) унізе: майстры спорту, двухразовыя чэмпіёнкі рэспубліканскай спартакіяды студэнтаў Н.Калькова, В.Гаўрыленка, у цэнтры — трэнер каманды Б.М.Гіль, уверсе — майстры спорту У.Катлоўскі, А.Сайдакар, Д.Шаўчук, першаразраднік Д.Васількоў і майстар спорту, трохразовая чэмпіёнка рэспубліканскай спартакіяды студэнтаў А.Лісаевіч.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

Дэканат фізічнага факультэта і калектыў кафедры оптыкі выказваюць глыбокае спачуванне лабарантцы названай кафедры **ДАШКЕВІЧ Наталлі Віктараўне** з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці **БРАТА**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 312.
Падпісана да друку 2.06.2000 г.